*Ганна Шпілеўская*

# КРАЯЗНАЎЧЫ КУРС У ВУЧЭБНЫХ ПРАГРАМАХ АДУКАЦЫЙНЫХ УСТАНОЎ

На сённяшні дзень можна канстатаваць, што кожны куток Беларусі яшчэ захаўвае свае звычаі, моўныя, фальклорныя, этнаграфічныя асаблівасці і традыцыі. Ва ўсе часы ва ўсіх дзяржавах важным сродкам фарміравання нацыянальнай свядомасці з'яўлялася далучэнне да гістарычна-культурнай спадчыны. Трывалае засваенне ведаў лепш адбываецца на блізкім чалавеку матэрыяле. Веданне гісторыі і традыцый свайго горада, раёна, вёскі дазваляе па-новаму ўсвядоміць мінулае, зразумець цяперашняе і ўявіць будучае ў выхаванні патрыятычных пачуццяў. Важная роля належыць краязнаўству. Нездарма ў адукацыйных праграмах акцэнтуецца значэнне краязнаўчых ведаў. Так, напрыклад, не з'яўляюцца выключэннем і нашы бліжэйшыя суседзі. Акрамя базавага курса «Сусветная мастацкая культура» (9 – 11 класы), расійскія школьнікі могуць выбіраць для вывучэння яшчэ і інтэграваны прадмет «Краязнаўства» (6 – 11 класы). Краязнаўчы курс у тых жа класах ва ўсіх тыпах школ на Украіне складае частку абавязковага прадмета «Мастацкая культура». На профільным узроўні яму адводзіцца нават чатыры гадзіны на тыдзень. У нашай сістэме адукацыі краязнаўчы кірунак толькі спадарожна рэалізоўваецца на ўроках па розных прадметах, а таксама ў пазакласнай і пазашкольнай дзейнасці.

Разам з тым можна адзначыць і станоўчыя тэндэнцыі. Сёння ў нашай краіне назіраецца адраджэнне краязнаўчага руху. Прынамсі, у школах узяты курс на стварэнне спецыяльных праграм па краязнаўству, правядзенне заняткаў па раёназнаўству. У стварэнні такіх праграм прымаюць удзел студэнты Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка пад кіраўніцтвам выкладчыкў кафедры этналогіі і фалькларыстыкі. Ужо існуюць праграмы спецкурсаў, факультатываў і гурткоў, сярод якіх – «Бярэзіншчыназнаўства», «Валожыншчыназнаўства», «Вілейшчыназнаўства», «Заслаўезнаўства», «Краязнаўства Лідчыны», «Лельчычыназнаўства, «Убарцка-Палескае краязнаўства», «Лунінеччыназнаўства», «Пухаўшчыназнаўства», «Стаўбцоўшчыназнаўства», «Фаніпалезнаўства» і інш. Некаторыя з гэтых праграм надрукаваны ці асобным выданнем, ці прадстаўлены ў зборніку матэрыялаў канферэнцыі [1], іншыя рыхтуюцца да друку.

Галоўныя задачы, якія ставяць перад сабой аўтары-складальнікі вучэбных праграм па краязнаўству, – гэта перш за ўсё паглыбленне ведаў школьнікаў, звязаных з родным раёнам, выхаванне нацыянальнай самасвядомасці, фарміраванне навыкаў пошукавай і даследчай працы, вывучэнне традыцый духоўнасці ў фальклоры, нацыянальнай культуры і г. д.

Падчас працы студэнты пастараліся сабраць самы цікавы матэрыял па гісторыі рэгіёнаў, іх духоўнай і культурнай спадчыне. Асноўнай крыніцай і

дапаможнікам пры стварэнні праграм з'яўляюцца тамы гісторыка-дакументальнай хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі «Памяць». Многія праграмы маюць універсальны характар: іх можна выкарыстоўваць пры вывучэнні такіх прадметаў, як гісторыя, літаратура і інш. У кожнай з іх прадстаўлены найбольш эфектыўныя метады і сродкі вядзення краязнаўчай работы, розныя тыпы і формы заняткаў са школьнікамі. Большасць скіравана на самастойны краязнаўчы пошук, навуковыя даследаванні па гістарычных дысцыплінах (археалогія, геральдыка, этнаграфія, генеалогія), арганізацыю музейнай справы, разнастайных форм краязнаўчай дзейнасці – экспедыцый, паходаў, экскурсій. Мяркуем, што даследчая дзейнасць у археалагічных разведках, этнаграфічных экспедыцыях, іншых пошукавых мерапрыемствах пашырае кругагляд, садзейнічае развіццю працавітасці, дакладнасці і сістэмнасці мыслення, умення аналізаваць і ідэнтыфікаваць музейныя экспанаты, павышае культурны ўзровень навучэнцаў. У склад кожнай з праграм абавязкова ўваходзіць пашпарт даследуемага раёна. Гэта кароткія энцыклапедычныя звесткі агульнага характару пра геаграфічны рэгіён і яго канкрэтную частку. Праграмны матэрыял у большасці выпадкаў складаецца з дзвюх частак, якія падзелены на тэмы. Першы раздзел – гістарычны, другі – культуразнаўчы. Безумоўна, найбольшую цікавасць у школьнікаў выклікаюць факты з жыцця вядомых людзей раёна: мастакоў, гістарычных дзеячаў, пісьменнікаў і г. д. Факультатыўны краязнаўчы курс не выпадкова пачынаецца і завяршаецца пагружэннем дзяцей у вобразную, эмацыянальна-экспрэсіўную сферу багатай вуснай народнай творчасці, беларускай літаратуры і мастацтва.

Вельмі важна, калі ў школу прыйдзе малады педагог з ужо распрацаванай праграмай, краязнаўчай работы і сабраным матэрыялам, з дапамогай якіх можна разгарнуць шырокую дзйнасць па патрыятычным і грамадзянскім выхаванні школьнікаў.

## ЛІТАРАТУРА

1. Краязнаўчая адукацыя і грамадзянскае выхаванне: Матэрыялы Рэсп. навук.-метад. канф., Мінск, 26 крас. 2006 г. / Бел. дзярж. пед. ун-т імя М. Танка; рэдкал. М. М. Круталевіч [і інш.]; А. С. Васілеўская і А. Ю. Лозка (адк. рэд.). – Мінск, 2006.